БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ 2020-ГА

# Сцяг з «Цудоўні» канфіскавалі другі раз за дзень. Міліцыя адрэагавала на «скаргі грамадзян»

9 ВЕРАСНЯ 2020, 20:47




*Капитан Александр Шульга (справа) и капитан Сергей Ремез изымают бумажный флажок в магазине "Цудоўня"*

**Каля 20.00 9 верасня ў краму «Цудоўня» прыехала міліцыя. Супрацоўнікі Ленінскага РАУС капітан Аляксандр Шульга і капітан Сяргей Рэмез сказалі, што прыехалі па скарзе грамадзян на бел-чырвона-белы сцяг, размешчаны ля**

**ўваходу ў краму. Тлумачэнні аб тым, чаму і як доўга вісіць бел-чырвона-белы сцяг, даваў прадавец крамы Антон Шаранкевіч.**



*Антон Шаранкевіч, прадавец крамы, тлумачыць капітану Сяргею Рэмезу, што бел-чырвона-белы сцяг — гэта элемент вонкавай рэкламы*

Супрацоўнікі забралі папяровы сцяжок на пластмасавым тронку і склалі пратакол канфіскацыі.

www.youtube.com/watch?v=PU1CFXyloFg

Копію дакумента міліцыянты не пакінулі. Зрабіць фотакопію не дазволілі. Хто менавіта паскардзіўся ў міліцыю, не паведамілі.




*Забіраць папяровы сцяжок на пластмасавым тронку прыехалі два капітана міліцыі. Копіі дакументаў аб канфіскацыі не далі*

Гэта ўжо другое выманне сцяга ў краме за 9 верасня. Каля 13.00 міліцыя ўжо прыязджала ў «Цудоўню». Адабранне сцяга матывавалі нібыта парушэннем парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт 23.34 КаАП).

**Чытайце больш:** Неизвестный пожаловался на бело-красно-белый флаг у «Цудоўні». Милиция его изъяла и составила протокол

ГРАМАДСТВА | ЗДАРЭННІ | КУЛЬТУРА | ПАЛІТЫКА | ПРАВА

0

## РАІМ ПАЧЫТАЦЬ

**Не аказалі дапамогу, была язва, адрэагаваў Савет Еўропы. Што вядома пра смерць палітвязня Алеся Пушкіна**

**Алеся Дзянісава і Алеся Кіркевіча аштрафавалі за матэрыял пра гродзенскія падзямеллі**

**Затрыманы ўладальнік кватэры, у якой забілі «тэрарыста» (дапоўнена)**

## АПОШНІЯ ЗАПІСЫ

**Хто выступіць у Гродне на Новы год (праграма)**

26 СНЕЖНЯ 2023, 14:05

**Пад Гальшанамі прадаюць 100-гадовы спіртзавод па цане 20-гадовага аўто**

26 СНЕЖНЯ 2023, 13:39

**У Фарным касцёле ў Гродне на Каляды працаваў АМАП**

26 СНЕЖНЯ 2023, 13:03

**Выйшла чарговая кніга «Гарадзенскай бібліятэкі» — пра прыгоды англічаніна ў Беларусі 1863 года**

25 СНЕЖНЯ 2023, 15:52



2016-2023 Выкарыстанне матэрыялаў сайта дазваляецца паводле правілаў ліцэнзіі Creative Commons BY-SA 4.0 Int са спасылкай на крыніцу і ўказаннем аўтара. Падрабязныя правілы перадруку тут .